УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# АЎРАМЧЫК МІКАЛАЙ ЯКАЎЛЕВІЧ

**ПАЭТ, ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК КУЛЬТУРЫ БССР,**
**ЛАЎРЭАТ ЛІТАРАТУРНАЙ ПРЭМІІ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ**

**14 СТУДЗЕНЯ 1920 Г. – 8 МАЯ 2017 Г.**

**ФОНД № 160**

**ВОПІС № 1**

**[кан. 1950-х] – 1977 гг.**

**МІНСК 2024**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 160**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ М.Я. АЎРАМЧЫКА | | |

## Прадмова

**Мікола (Мікалай Якаўлевіч) Аўрамчык** нарадзіўся 14.01.1920 г. у вёсцы Плёсы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. У роднай вёсцы скончыў пачатковую школу, пасля – Цялушскую сярэднюю школу. У 1938 г. паступіў на філалагічны факультэт Мінскага педінстытута імя М. Горкага, адначасова працаваў у рэдакцыі газеты “Піянер Беларусі”. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Паўночна-Заходнім і Волхаўскім франтах. Пры акружэнні ў чэрвені 1942 г. трапіў у палон і быў вывезены на каменнавугальныя шахты Рура (Германія). Пасля вайны працаваў на аднаўленні Данбаса. Потым вярнуўся ў Мінск і пачаў працаваць у рэдакцыях газет “Чырвоная змена”, “Літаратура і мастацтва”, часопісаў “Полымя”, “Маладосць”. У 1949 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ імя У.І. Леніна. У 1953–1980 гг. – рэдактар аддзела паэзіі часопіса “Маладосць”.

Член СП СССР з 1947 г. Друкавацца пачаў у 1937 г. на старонках бабруйскай газеты “Камуніст”. Аўтар кніг паэзіі “Пярэдні край” (1949), “Шляхамі дружбы” (1952), “Ключы жураўліныя” (1960), “Сустрэча былых канагонаў” (1963), “Універсітэцкі гарадок” (1967), “Агледзіны” (1969), “Як на далоні” (1970), “Дрэва дружбы” (1973), “Радовішча” (1976), рамана “У падзямеллі” (1986) і інш. Перакладаў на беларускую мову творы Дж. Байрана, М. Джаліля, А. Міцкевіча, Л. Украінкі, І. Франка, Г. Эміна, зборнікі вершаў С.У. Міхалкова “А што ў вас?”, В.В. Бычко “Тры сястры” (1953), паэму М.Л. Нагнібяды “Васілёк” (1961) і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы за зборнік вершаў “Сустрэча былых канагонаў” (1963).

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, “Знак Пашаны”, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўных Саветаў БССР, Украінскай ССР, Літоўскай ССР.

Памёр М.Я. Аўрамчык 08.05.2017 г., пахаваны на Паўночных могілках.

Дакументы М.Я. Аўрамчыка паступілі ў БДАМЛМ 22.08.1977 г. ад самога пісьменніка. У 2023 г. пасля НТА быў складзены воп. № 1 у колькасці  6 спраў (42 дак.) за [кан. 1950-х]–1977 гг. У вопіс увайшлі  вершы за 1969-1977 гг., артыкул да 60-годдзя з дня нараджэння П.Е. Панчанкі, успаміны пра П.Ф. Глебку, аўтабіяграфія, індывідуальныя фатаграфіі.

Вядучы архівіст І.А. Евенка

23.10.2023

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК
ад 4.01.2024
№ 1

ФОНД № 160
ВОПІС № 1
[кан. 1950-х] - 1977

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ М.Я. АЎРАМЧЫКА** | | | | |
| 1 | "Мая Бабруйшчына зялёная", "Ода Каралішчавічам", "Радовішча", "Роднае" і інш. Вершы.<br>Чарнавы аўтограф | 1969-1974 | 18 | 19 | |
| 2 | "Акраец", "Маленне", "Неяк раз у застоллі вясёлым...", "Рабінавая ноч" і інш. Вершы.<br>Чарнавы аўтограф | 1975 | 18 | 18 | |
| 3 | "Ліст прызнання". Артыкул да 60-годдзя з дня нараджэння П.Е. Панчанкі.<br>Чарнавы аўтограф | 1977 | 5 | 1 | |
| 4 | "Такі ён быў у жыцці". Успаміны пра П.Ф. Глебку.<br>Чарнавы аўтограф | 1975 | 5 | 1 | |
| 5 | Аўтабіяграфія.<br>Аўтограф | 1977 | 3 | 1 | |
| 6 | Фатаграфіі М.Я. Аўрамчыка, індывідуальныя | [кан.1950-х гг., 1969] | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 6 (шэсць)
спраў з № 1 па № 6 , 42 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла вяд. архівіст І.А. Евенка

03.01.2024

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў ____________ В.І. Бярэйшык

______________________

"_____"____________20____ г.